# ЗМЕСТ


Лясун і два браты ........ 7
Як музыка чарцям граў ........ 13
Кравец пад каменем ........ 17
Доля і злыдні ........ 18
Сястра і браты-ваўкалакі ........ 23
Як певень дзеўку збавіў ........ 29
Баран з-пад печы ........ 31
Як цыган змея ашукаў ........ 33
Русалка ........ 37
Селянін і цмок ........ 38
Дзяцюк і чортава дачка ........ 43
З рога ўсяго многа ........ 50
Пра ведзьмара, які рабіўся ваўком ........ 54
Чужога снапа не бяры ........ 56
Гуменнікава дачка ........ 58
Лёкай-камень ........ 60
Адкуль бяруцца кнігі ........ 66
Бядак і разбойнікі ........ 67
Дабрахот ........ 76
Мёртвая пані і грошы ........ 78
Пакацігарошак ........ 79
Мужык, чорт і мядзведзь ........ 87
Балотныя паны ........ 89
Пра двух братоў і каралеўну-вупара ........ 91
Вужовы рожкі ........ 99
Селянін і трасца ........ 100
Калі Бог дасць, дык і ў акно падасць ........ 102
Дзедава дачка і бабіна дачка ........ 104
Чорт і льняное поле ........ 109
Пра хлопца, які вучыўся ў ведзьмара ........ 111
Тры яблыкі ........ 117
*Заўвага ад укладальніка* ........ 119

# ЛЯСУН І ДВА БРАТЫ

*Кірыла Анікіевіч з вёскі Цюцькі паблізу Сянна расказваў*

Жыў адзін чалавек, і было ў яго два сыны. Жыў ён багата, а як сабраўся паміраць, то паклікаў старэйшага сына і загадаў, каб той падзяліў спадчыну з братам пароўну. Вось памёр бацька, а старэйшы брат усё сабе забраў, не даў меншаму анічога. І было ў меншага брата чацвёра дзяцей, а чым іх карміць — не было. Раз паслаў яго пан занесці некаму ліст. Мужык ліст занёс, ідзе назад, і абняла яго сярод пушчы цёмная ноч. Ён узяў ды ўзлез на елку, каб там заначаваць. Толькі быў задрамаў, чуе — нехта свішча. Глядзіць — а гэта лясун ваўкоў гоніць. Падагнаў да елкі, на якой мужык сядзеў, ды кажа:

— А што, будзем тут начаваць!

— Будзем, — кажуць ваўкі.







Тады лясун выняў з-за пазухі сярнічку, шморгнуў яе аб грудзі ды пачаў раскладаць агонь, а ваўкі ўзяліся насіць дровы. Загарэлася цяпло, лясун вымае бохан хлеба. Падзяліў усім па лусце, і яшчэ адна луста засталася. Потым узяў сала шматок, пакроіў усім па трохі, і зноў кавалак застаўся. Лясун узяў тыя хлеб ды сала, што засталіся, ды кажа мужыку на елцы:

— На і табе, чалавечак, ведаю, што ты есці хочаш.

Мужык кажа:

— Я ваўкоў баюся.

А лясун яму:

— Не, не бойся, — і хлеб з салам на сучок паклаў.

Мужык і есці хоча, і злезці баіцца. Так і прасядзеў цэлую ноч на елцы. Лясун пераначаваў, а раніцаю зноў пагнаў свой статак — засвістаў, загагатаў, пугаю заляскаў. Глядзіць мужык, што ваўкі ўжо далёка, злез з елкі, узяў хлеб ды сала і пайшоў дамоў: аднясу, думае, дзецям, бо яны ж не еўшы сядзяць. Прыйшоў, паклаў усё на стол ды кліча дзяцей і жонку. А хлеб той як сонца ззяець. Пачалі яны есці, дык ні хлеба не менее, ні сала, колькі ні бяры.

А тут зайшла да іх дачка старэйшага брата, дык і ўгледзела гэтае дзіва. Пабегла дамоў і кажа:

— Татачка, які я хлеб у дзядзькі бачыла — усё адно як сонца!

Пазайздросціў багаты брат беднаму, прыходзіць да яго і пытаецца:

— Дзе ты, брат, узяў хлеба такога харошага? Я багаты, і тое гэткага не маю.

Брат і расказаў яму ўсё па праўдзе. Тут старэйшага зусім зайздрасць узяла. Пайшоў ён дамоў ды кажа жонцы зварыць яму чаго-небудзь у дарогу. Яна яму наварыла, напякла мяса, пірагоў, каўбас. Сабраў ён усё і пайшоў прасіць меншага брата, каб той паказаў, дзе лесуна сустрэў. Брат прывёў яго да елкі, на якой начаваў. Улез старэйшы брат на елку, а меншы пайшоў сабе дамоў. Даў Бог ноч. Хутка чуе багацей — нехта свішча: гоніць ізноў лясун свой статак.

— Ну што, — кажа ваўкам, — хочаце начаваць ужо?

— Хочам!

Пачаў лясун цяпло раскладаць, а ваўкі дроў нацягалі. Як разгарэлася цяпло, дастаў лясун хлеб ды стаў кроіць: усім адкроіў па скібцы, а апошняму не хапіла. Тады стаў дзяліць шматок сала: усім па кавалку, а апошняму зноў не хапіла. Усе ваўкі ядуць, а адзін галодны сядзіць. Пытаецца воўк у лесуна:

— А мне што есці?

— А табе — вунь таго чалавека! — кажа лясун і на багацея паказвае.

Воўк падышоў да елкі, стаў ды чакае. Багацей сядзіць ні жывы ні мёртвы, не ведае, на якім ён свеце, на тым ці на гэтым. А воўк стаяў, стаяў ды выць пачаў. Даў Бог дзень, пагнаў лясун ваўкоў прэч, а той адзін усё стаіць ды вые. Багацей трасецца, але ж каўбасы есць, а ваўку хоць падыхай. Павыў, павыў воўк, ды і пабег сваіх даганяць.

Раніцаю багацей злез з елкі ды хутчэй дамоў. А сам дужа цешыцца, што жывы застаўся. З такой радасці паклікаў ён суседзяў у госці ды частаваў іх да самага вечара. Глядзяць госці, а ў хату шэры коцік убег — лета было, дзверы не зачынялі. Усе з коціка цешацца, гладзяць яго — во які слаўны, прыгожы. А той раз — і пад печку. Павячэралі госці, сталі класціся спаць — хто ў пуні на сене, хто да сябе пайшоў, а гаспадар у доме застаўся. Як заснулі ўсе, вылез коцік з-пад печы, скінуўся ваўком, сцягнуў гаспадара з палацяў і перагрыз яму горла, і так, па праўдзе сказаць, ледзь не ўсяго з’еў, адныя костачкі засталіся. А сам у лес уцёк. Даў Бог дзень, заходзяць госці ў хату — а там вунь што здзеялася.





# ЯК МУЗЫКА ЧАРЦЯМ ГРАЎ

*Змітрук Прасняк з Куклічаў паблізу ад Ружанаў расказваў*

Быў сабе адзін музыка. Пайшоў ён раз на кірмаш, каб новую скрыпку купіць. Ідучы з кірмашу, сустракае незнаёмага пана. Пан яму кажа:

— Хадзі, музыка, да мяне на вечарынку. Будзеш нам граць, а я табе колькі хочаш, столькі заплачу.

Чаго не пайсці? Пайшлі яны. Прыходзяць у палац, а там золата паўсюль, ледзь не сыплецца, а гасцей, а паненак пекна ўбраных так шмат, што і не злічыць. Просяць яго, каб зайграў. Пачаў музыка граць, а госці давай скакаць, а як упацее хто, дык ідзе да ручніка, твар абатрэ і далей скача. Граў музыка, граў, ніяк яму не давалі адпачыць, нават і сам упацеў, граючы. Падышоў да ручніка, правае вока абцёр. Глядзіць гэтым вокам, ажно госці — тое чэрці рагатыя, палац — тое багно, залатыя крэслы — тое карчы з мохам, а сядзіць ён сам на купіне, а ногі ў балоце, а грошы, што яму давалі, — тое вуглі ды гной. А тут яму яшчэ грошай нясуць, такіх самых. Ён, вядома, не хоча гною браць, сапраўдных грошай патрабуе. Здзівіліся чэрці, як гэта ён вызнаў, ды зараз жа яму кажуць, каб кідаў граць ды ішоў сабе дамоў. Ідзе музыка, а сам сумняецца — тыя грошы, што за пазуху паклаў, ці сапраўдныя, а ці таксама гной. Аж тут якраз пры дарозе карчма. Музыка зайшоў ды кажа карчмару:

— Дай гарэлкі!

А карчмар яму:

— Ну а дзе грошы?

Музыка сунуў руку пад паху дый выцягнуў цэлую жменю паскудства. Карчмар ухапіў венік — ды за ім.

— А ты такі! А ты сякі! Карчму мне хочаш засмуродзіць, каб ніхто не ўвайшоў!



